# АКУПАЦЫЯ

## (10.07.1941-10.07.1944)



Герой Савецкага Саюза маёр К.С. Гнедаш (1914-1944).




Мінская вобласць. Салігорскі раён. Помнік братам-героям Івану і Міхаілу Цубам.

***(Працяг. Пачатак у №№ 67-68, 76-77, 120, 123-124, 126, 130-131, 134, 137-138).***

Да канца 1942 года на Лунінеччыне ўжо заявілі пра сябе арганізаваныя дзеянні партызан. Акупацыйныя ўлады распачалі першую спробу знішчыць лясных мсціўцаў, правёўшы карную аперацыю «Hornung». У час яе здзейснілі подзвіг жыхары в. Навіна браты Цубы. Уварваўшыся ў вёску ў лютым 1943 года, фашысцкія карнікі загадалі 70-гадоваму Міхаілу Самуілавічу паказаць дарогу да партызан. Стары адмовіўся і тут жа быў расстраляны. 75-гадовы Іван Самуілавіч згадзіўся быць правадніком і завёў карнікаў у балоцістыя берагі ракі Лань, адкуль фашысты не знайшлі дарогі назад. Ён таксама быў расстраляны. Аб гэтым выпадку ведалі лунінчане ў першыя гады акупацыі, хаця тады Навіна знаходзілася ў іншым раёне. У 60-ыя гады вёска стала часткай Лунінеччыны. Менавіта выканкам Лунінецкага раённага Савета дэпутатаў працоўных у 1964 годзе ўвекавечыў імёны герояў. У рашэнні з гэтай нагоды было запісана: «У гонар сялян в. Навіна Хорастаўскага сельсавета братоў Івана і Міхаіла Цубаў, паўтарыўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны подзвіг Івана Сусаніна, перайменаваць вёску Навіна ў вёску Цуба». Цяпер яна ўваходзіць у Салігорскі раён Мінскай вобласці. У вёсцы Вялікі Лес гэтага ж раёна братам Цубам устаноўлены помнік. У 80-ыя гады Міністэрства сувязі СССР выпусціла мастацкі канверт з выявай гэтага помніка ***(здымак 1)***.

Позняй вясной 1944 года па горадзе распаўсюдзіліся звесткі аб савецкіх парашутыстах, якія разам з партызанамі ўзрывалі ваенныя эшалоны, нападалі на гарнізоны, малыя станцыі. Чуткі абрасталі неверагоднымі падрабязнасцямі. Гаварылі, што парашутыстаў ледзь не цэлы полк, што ў іх ёсць нават гарматы, што быццам іх бачылі пад Лунінцам і г.д. Ужо ў чэрвені гараджане пачулі яшчэ адну навіну, якую перадавалі пад вялікім сакрэтам. Гаварылі, што эсэсаўцы-карнікі высачылі групу развед-

што ляцеў не вельмі высока. Вясновай раніцай ён быў добра бачны ў небе, таму па самалёту адкрылі агонь нямецкія зенітчыкі. Потым у горадзе казалі, што страляла мадзьярская зенітная батарэя. Самалёт загарэўся і ўпаў у балоцістым лесе каля Зялёнага моста. Так называўся вялікі раён у 4-5 кіламетрах за лакаматыўным дэпо ў бок Кажан-Гарадка. Да збітага самалёта раней за немцаў паспелі прыбегчы некалькі мясцовых мужчын і хлопчыкаў. Вакол месца падзення самалёта былі раскіданы крылы, хваставое апярэнне, зламаныя дрэвы. Ад моцнага ўдару насавая частка глыбока ўвайшла ў мокрую балоцістую зямлю. Там жа былі знойдзены акрываўленае адзенне, зброя, дакументы, карты. Загінуўшых лётчыкаў не выявілі. У горадзе казалі, што іх пахавалі тыя члены экіпажа, што засталіся ў жывых, і самі пайшлі «да сваіх, у партызаны». Потым стала вядома, што дакументы падабраў лунінчанін Пустаход, які пасля вызвалення быццам бы аддаў іх у ваенкамат. Шкада, што тады ніхто не высветліў абставін гібелі самалёта і цяпер няма каму гэтым заняцца...

Калі пачаліся бамбардзіроўкі Луні-



Achtung!
Внимание!

Der kleine Verkehrsschein berechtigt nur zum Verkehr, insbesondere in den Sperrstunden, soweit das zu dem angegebenen Zwecke erforderlich ist.

Abdruck des linken Zeigefingers

Nur ausfüllen, wenn der Inhaber von der Verpflichtung befreit ist, einen Personenausweis führen zu müssen.

Weitere Vornamen

geb. am

wohnhaft in

Rayon*) — Kreis*)

Volkstum — angeblich

den 5.7. 194

Der Gebietskommissar

Der Orts-*) — Kommandant

I. A.

Gebühr

кіслародных балонаў. Тады ж была часткова разбурана яўрэйская сінагога. Савецкая авіяцыя разбіла некалькі эшалонаў на станцыі.

З самалётаў кідалі не толькі бомбы, але і лістоўкі, якія заклікалі да барацьбы з ворагам, паведамлялі пра хуткае выз-

У гады акупацыі лунінчане часта выстаўлялі іконы ў вокны: пры ўступленні немцаў у горад, ліквідацыі яўрэйскага гета, знішчэнні Мелясніцы, аблавах, вывазах у Германію, бамбёжках...

Толькі адзін раз на дальні канец нашага агарода, каля сажалкі, упала касета з трыма невялікімі бомбамі. Яны чамусьці не ўзарваліся. Некалькі дзён ляжалі ў траве, паблісківаючы металічнымі бакамі. Зразумела, што ніхто імі не цікавіўся. Такіх у той час было многа. Потым бацька скінуў бомбу ў сажалку, пасля вайны яе засыпалі. Пра бомбы забыліся.

Да канца 1943 года Лунінец ужо дастаткова страціў той штучна прыгладжаны выгляд, які акупанты спрабавалі надаць параненаму вайной гораду. Дагэтуль яны арганізоўвалі летнія музычныя вечары ў парку, канцэрты казакаў на цэнтральнай вуліцы, выганялі на ўборку мясцовых жыхароў і выкарыстоўвалі для гэтых мэт групы ваеннапалонных. Змянілася, хутчэй, нават не знешняе аблічча, хаця яго зялёнае ўбранне крыху зменшылася – немцы высеклі частку дрэў на вуліцах і ў садах, на вуліцах паявіліся ДЗОТы і пераносныя «яжы» з калючага

са сваімі дамачадцамі былыя паліцаі, бургамістры, старасты і іншыя сябры акупантаў. Немцы на іх ужо не звярталі ўвагі – самі ратавалі сваю шкуру. А «бежанцы» з Бранскай, Смаленскай, Ровенскай, Чарнігаўскай, Гомельскай абласцей, са Здалбунава, Сарнаў, з-за Прыпяці імкнуліся хутчэй дабрацца да Буга, да Генерал-Губернатарства на сваіх фурманках і брычках. Другія спяшаліся трапіць на Лунінецкі вакзал, каб сесці на поезд, які ішоў на захад, у Германію. Да ваеннага каменданта Эйземана на станцыі стаялі доўгія чэргі ўцекачоў. Для далейшага руху ў поездзе на захад усе павінны былі атрымаць так званы дазваляльны білет – «малую пуцёўку» ***(здымак 3)***, падпісаную камендантам. А праз Лунінец з украінскага напрамку ішлі паязды з чыноўнікамі рэйхскамісарыяту «Украіна», ехалі сем'і і везлі нарабаванае дабро. Наперадзе і ў хвасце кожнага эшалона чаплялася платформа з мяшкамі з пяском і ўстанаўлівaўся кулямёт.

У пачатку 1944 года на вуглу вуліц Млынавая і Чырвоная (тады Шырокая) у вялікім драўляным доме (ён і цяпер стаіць каля паліклінікі, пафарбаваны ў жоўты колер) размясцілася Смаленскае СД, якое збегла ад наступаўшых войск Чырвонай Арміі ў больш ціхае месца. У двары каля дома ваеннапалонныя чырвонаармейцы за некалькі дзён выкапалі вялікую яму і пабудавалі ў ёй з тоўстых бярвенняў бункер, пакрыўшы яго ў тры накаты такімі ж тоўстымі сасновымі бярвеннямі. У бункеры былі 4 выхады і некалькі памяшканняў-пакояў, якія злучаліся паміж сабой. У час начных бамбардзіровак горада савецкай авіяцыяй вясной і летам 1944 года тут хаваліся не толькі немцы, але і жыхары многіх навакольных дамоў. Немцы і іх памагатыя – некалькі рускіх здраднікаў – займалі асобнае памяшканне, насельніцтва – пакоі, размешчаныя бліжэй да выхаду. Пры бамбёжках савецкія лётчыкі кідалі спачатку асвятляльныя бомбы на парашутах. Некалькі такіх бомбаў ператваралі ноч у ясны дзень, заліваючы наваколле асляпляльна яркім белым святлом. Лётчыкам горад быў бачны, як на

вялікім сакрэтам. Гаварылі, што эсэсаўцы-карнікі высачылі групу разведчыкаў-парашутыстаў, што быў жорсткі бой, у выніку якога ўсе савецкія разведчыкі загінулі, а камандзір і радыстка доўга адстрэльваліся з зямлянкі, а потым падарвалі сябе гранатай. Гаварылі, што адбылося гэта пад Лунінцам ці ў дальнім месцы раёна.

У наступныя гады горад і гараджане перажылі шмат новых розных падзей, таму пра ваенны эпізод перыяду акупацыі 1944-га хутка забыліся. Наогул пасляваенны час меў шмат дзіўнасцей. Адныя эпізоды барацьбы з акупантамі забываліся свядома, другія, нават менш значныя, усхваляліся. Ніхто, акрамя НКУС і МДБ, не цікавіўся жыццём Лунінца і лунінчан у час акупацыі. І толькі ў 70-ыя гады стала вядома, што чуткі мелі пад сабой рэальную падставу. Праўда, бой разведчыкаў адбыўся ў лесе пад Слонімам, дзе 19 чэрвеня 1944 года яны былі акружаны карнікамі. Пасля іх гібелі цяжка паранены маёр К.С. Гнедаш і радыстка К.Т. Давідзюк, каб не трапіць у рукі ворага, падарвалі сябе гранатай.

У 1943-1944 гг. разведгрупа пад камандаваннем Кузьмы Савельевіча Гнедаша (тады яшчэ капітан, ён падпісваў свае данясенні пазыўнымі КІМ) – камандзіра аператыўна-дыверсійнага цэнтра разведаддзела 1 Беларускага фронта вяла разведку і дыверсійную работу ў раёне Лунінца, Кобрына, Брэста, Пінска, Слуцка. Група знішчыла 21 эшалон з жывой сілай і тэхнікай, 10 параходаў, 14 баржаў, перадала ў цэнтр каштоўныя звесткі аб праціўніку. К.С. Гнедаш (у розных даведніках яго прозвішча пішацца па-рознаму) пасмяротна быў удастоены звання Герой Савецкага Саюза, пахаваны ў горадзе Слонім Гродзенскай вобласці. У 70-ыя гады Міністэрства сувязі СССР выпусціла паштовы канверт з партрэтам разведчыка ***(здымак 2)***, які таксама можна лічыць адным з экспанатаў «філатэлістычнай Лунінеччыны».

У красавіку 1944 года паявіўся савецкі самалёт-бамбардзіроўшчык з боку Пінска на поўдзень ад Лунінца на адлегласці Віра. Відавочна, быў ужо пашкоджаны, таму пер няма каму гэтым заняцца...

Калі пачаліся бамбардзіроўкі Лунінца савецкай авіяцыяй, многія гараджане былі ўпэўнены, што гэта адбываецца з-за збітага самалёта, што лётчыкі помсцяць за гібель таварышаў. З мая да канца чэрвеня амаль кожную ноч Лунінец бамбілі. Бомбы цалкам знішчылі два гарадскія млыны. Адзін з іх на вуліцы Млынавая (за цяперашняй раённай паліклінікай) быў толькі разбомблены, не згарэў, але аднаўленню не падлягаў. Яшчэ доўгі час пасля вайны разбураны будынак млына з пакарабачаным лакамабілем і іншымі машынамі нагадваў пра яе. Паступова руіны разабралі, пустка зарасла бур'янам, потым нешта пабудавалі. Другі млын – буйнейшы ў раёне – знаходзіўся паміж цяперашнімі вуліцамі Савецкая, 17 Верасня і Пінская (да 1944 года апошняя не злучала дзве першыя) – на гэтым невялікім адрэзку Пінскай і тэрыторыі бліжэй да райваенкамата. У адзін з налётаў ён быў цалкам разбураны і спалены. У час пажару згарэлі ўсе навакольныя лунінецкія дамы, у тым ліку і вялікі дом галоўнага лунінецкага ляснічага фальксдойча Макса. У гэты раён трапілі некалькі бомбаў. Ад асколкаў загінулі некалькі дарослых і дзяцей, загінула жывёла. Адна з бомбаў упала на брук вуліцы Савецкая, каля крыла прыгожага будынка цяпер музычнай школы, дзе тады размяшчаўся нямецкі шпіталь. Выбухам разбурыла і амаль знесла гэтую сіметрычную частку будынка, якая пасля вайны не была адноўлена.

Прыкладна ў тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца танцпляцоўка, быў размешчаны невялікі лагер савецкіх і італьянскіх ваеннапалонных – некалькі зборных круглых фанерных баракаў. Сюды таксама трапіла бомба. Загінулі, былі апечаны многія ваеннапалонныя. Іх пахавалі разам на праваслаўных могілках – цяпер гэта месца забыта. Загінуўшых нямецкіх салдат са шпіталю пахавалі на ваенных могілках на вуліцы Чырвоная.

У іншыя ночы бамбардзіровак былі разбураны дамы па вуліцах Чырвонаармейская, Царкоўная, Фабрычная, Чырвоная і іншых. На тэрыторыі былога гета, дзе ў 1944 годзе было некалькі рамонтных ваенных майстэрань, бомбы выклікалі пажар і шматразовыя моцныя выбухі але і лістоўкі, якія заклікалі да барацьбы з ворагам, паведамлялі пра хуткае вызваленне.

У Лунінцы стаялі нямецкія і мадзьярскія зенітныя батарэі, некалькі пражэктараў. Яны вялі агонь па савецкіх самалётах, але так і не збілі ніводнага, ніводнага не схапілі ў прамень пражэктара. Наадварот – лётчыкі вялі паляванне і за зенітчыкамі, і за пражэктарыстамі. І пасляхова – некалькі зенітак было разбіта.

У першыя ночы налётаў савецкіх самалётаў лунінчане заставаліся ў горадзе, хаваючыся ў рознага роду склепах. Але, бачачы разбураныя ненадзейныя сховішчы, многія сталі на ноч ісці ў лес. Штодня вечарам у раён Віра, да Вулькі 1, згарэўшай Мелясніцы ішлі гараджане цэлымі сем'ямі, няслі на руках дзяцей, вялі іх за рукі. Хтосьці нёс самыя неабходныя рэчы і дакументы, хтосьці вёз скарб на захаваўшымся веласіпедзе. Каб перачакаць, перажыць бамбардзіроўку. У лесе ўладкоўваліся спаць. Ноччу бачылі над горадам зарыва, усполахі зенітак, святло асвятляльных бомбаў. А ранкам усе ішлі дамоў і спадзяваліся, што іх дом уцалеў, а па дарозе бачылі варонкі ад бомбаў, упаўшыя тэлеграфныя слупы, вывараченыя з каранямі дрэвы. І ўсе са страхам думалі, што вось за вуглом замест роднага дома ўбачаць груду развалін, папялішча.

Лёс неяк збярог наш дом ад вайны. Магчыма таму, што кожны раз перад бамбёжкай ці ідучы на начоўку ў лес, мая маці, глыбока веруючы чалавек, выстаўляла ў акно невялікі абраз – літаграфічную копію са святой іконы Багародзіцы – Неапалімая Купіна. (Яна вядома з XVIII века. У апісанні гаворыцца, што ікона ўяўляе сабой выяву блакітнага круга, які гарыць, – неба з анёламі і зоркамі. На крузе – васьміканцовая зорка, якая складаецца з двух чатырохкутных зорак: адной – вогнена-чырвонай, другой – зялёнай. У сярэдзіне зялёнай зоркі «Маці Божая з Боганемаўлям». На кутках чырвонай – адлюстраваны чалавек, леў, цялец і арол – як бачаныя знакі Евангельскага расповяду пра той агонь, які неапаліма прыняла на сябе Прачыстая Дзева». Ад святой іконы «было дзіўнае зіхаценне ў час пажару».)

зменшылася – немцы высеклі частку дрэў на вуліцах і ў садах, на вуліцах паявіліся ДЗОТы і пераносныя «яжы» з калючага дроту. Многае засталося ранейшым, але пацьмянелі самі заваёўнікі. Нямецкія афіцэры, салдаты, іх саюзнікі, чыноўнікі розных устаноў, гестапаўцы і жандармы, служачыя СД і паліцыі, а разам з імі і іх прыхвасні – паліцаі, фальксдойчы, здраднікі, – усе яны дзень да дня станавіліся ўсё больш хмурныя і заклапочаныя. Усё радзей з дамоў, дзе жылі акупанты, былі чутны гук губнога гармоніка з матывам «Лілі Марлен» ці мелодыя з патэфоннай пласцінкі «Ружа-Мундэ». Усё часцей на дзвярах камісійных магазінаў вісеў замок, а хутка неяк ціха паехалі і самі ўладальнікі гэтых гандлёвых кропак. Нават кінатэатр і рэстараны пачалі радзей працаваць. Хаця самі акупанты не падабрэлі – наадварот, зверствавалі з яшчэ большай лютасцю, штодня здзяйсняючы экзекуцыі на «бензінцы», у лесе каля аэрадрома паставілі шыбеніцу. Але адчувалася, што адбыўся надлом у акупацыйнай машыне.

Пераканаўчымі вестунамі таго, што пара ачышчэння Лунінеччыны ад іншаземных прышэльцаў ужо не за гарамі, былі так званыя «бежанцы» з усходніх абласцей. Колькасць іх павялічвалася штодня. Пачуўшы гром кананады савецкай артылерыі, падганяемыя страхам адказнасці за здзейсненыя злачынствы, фашысцкія прыхвасні загадзя, апярэджваючы гаспадароў, якія адступалі пад моцнымі ўдарамі савецкіх войск, спяшаліся ўцякаць на захад. У Лунінцы сталі паяўляцца нагружаныя да мяжы мяшкамі, цяжкімі скрынямі, куфарамі парагонныя падводы, на якіх сядзелі разам у ясны дзень, заліваючы наваколле асляпляльна яркім белым святлом. Лётчыкам горад быў бачны, як на далоні, як у той вядомай песні: «Мне сверху видно все...». Нямецкія зенітчыкі, якія не мелі магчымасці весці агонь па савецкіх самалётах, стралялі па гэтых бомбах, нават асвятляючы іх пражэктарамі, але збіць не ўдавалася ніколі. Па гэтых «светлячках» ці «свечках», як называлі бомбы людзі, стралялі не толькі з зенітак – па іх вялі прыцэльны агонь з вінтовак. У двары СД, ля бункера, асаблівымі намаганнямі вызначаўся нейкі Фёдар, рускі перакладчык. Хлопчыкі, якія стаялі каля ўвахода ў бункер, неаднаразова бачылі, як Фёдар, надзеўшы супрацьсонечныя акуляры, выпускаў са сваёй савецкай хуткастрэльнай вінтоўкі-дзесяцізарадкі кулю за куляй у адну са «свечак», што вісела над горадам. Злосць адольвала здрадніка, але збіць ці пашкодзіць бомбу ён ніколі не мог. Відавочна, савецкія лётчыкі заўважылі ўспышкі выстралаў, якія вяліся з аднаго і таго ж месца на працягу некалькіх начэй. У адзін з начных налётаў яны скінулі на гэтыя ўспышкі бомбы, якія ўзарваліся на бліжэйшых агародах, а адна ўпала прама ў комін дома, дзе размяшчалася СД. Ворагам пашанцавала: бомба не выбухнула, але дах дома быў сарваны (асеў), комін разбурыўся і ў цаглінах тарчаў хвост авіябомбы. Фашысты і здраднікі пачалі хутка збіраць сваю маёмасць, грузіць усё на машыны і праз некалькі дзён пабеглі на захад.

**Л. КОЛАСАЎ.**

**Працяг будзе.**

Жыхары 6-га пад'езда дома 4-б па вул. Блока глыбока смуткуюць з прычыны трагічнай смерці **Уладзіміра Васільевіча ШУЛЯКА** і выказваюць шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў філіяла «Грамадскае харчаванне» райспажыўтаварыства выказвае глыбокае спачуванне **Марыі Антонаўне ЗАІКА** ў сувязі са смерцю **мужа**. Глыбока смуткуем разам з Вамі, падзяляем вялікае гора. Няхай наша душэўная спагада будзе для Вас падтрымкай у гэту цяжкую хвіліну.

Калектыў філіяла «Аўтабаза» райспажыўтаварыства выказвае спачуванне вадзіцелю **Канстанціну Сяргеевічу ГОМАНУ** ў сувязі са смерцю **маці**.

Калектыў ААТ «Лунінецкая райаграпрамтэхніка» выказвае глыбокае спачуванне **Сяргею Сяргеевічу ТРЫСЦЕНЮ** з прычыны напаткаўшага яго гора – смерці **сястры ТАЦЦЯНЫ.**